# ТРАДЫЦЫЙНАЯ МАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТРА БЕЛАРУСАЎ

# 1. Паняцце традыцыйнай культуры

# Традыцыйная (народная) культура

- уключае культурныя пласты розных эпох, яе суб’ектам з’яўляецца народ – калектыўная асоба, што аб’ядноўвае ўсіх індывідаў калектыва супольнасцю культурных сувязяў і механізмаў жыццядзейнасці.

# Характэрныя рысы

- - даіндустрыяльная (дамадэрная)
- - дапісьмовая (перадаецца ў веснай традыцыі, не мае аўтарства)
- - этнічная
- - сялянская (узор - 2 пал. XIX ст.)
- - паўсядзённая
- - неспецыялізаваная (непрафесійная)
- - кансерватыўная

# Матэрыяльная культура

- сукупнасць матэрыяльных каштоўнасцей і жыццёвых даброт, створаных народам у працэсе гістарычнай дзейнасці (*прылады працы, жыллё, культавая архітэктура, абарончыя збудаванні, транспартныя сродкі, ежа, адзенне, амуніцыя і ўзбраенне, бытавыя і рытуальныя рэчы, прадметы мастацтва і інш.*)

# Духоўная культура

- сукупнасць духоўных каштоўнасцей і дасягненняў (*гуманітарныя і тэхнічныя веды, працоўныя навыкі, звычаі, абрады, разнастайныя віды мастацкай творчасці, мова, самасвядомасць, рэлігія, мараль, права і да т. п.*)

# 2. Традыцыйная матэрыяльная культура

# 2.1. Гаспадарчыя заняткі

## Земляробства

***Культуры***

- жыта, авёс, ячмень, пшаніца
- лён, каноплі
- бульба (XIX ст.), буракі, капуста, агуркі, цыбуля, морква
- яблыні, грушы, слівы, парэчкі, агрэст

***Сістэмы земляробства***

- падсечна-агнявая
- абложная
- трохполле
- шматполле

Найбольш прыдатная для земляробства – сярэдняя паласа Беларусі

# Земляробчыя прылады

**саха і**
**плуг**

барана-
вершаліна

барана-
смык

плеценая
барана

рамная
барана

серп

Сявеньк

Сяўба

Жніво

Каса-
літоўка

Цэп для
малацьбы

жорн
ы

ступ
ы

Ветраны і вадзяны

Апрацоўка
льна

# Земляробчыя абрады

- Вясна – пачатак года
- Першы выхад у поле – агледзіны нівы, заворванне, сяўба.
- Арыентыр – нерухомыя каляндарныя святы
- Уборка ўраджаю – зажынкі (першы сноп –“гаспадар”), дажынкі (апошні сноп – “жытняя баба”)

# Жывёлагадоўля

Прадукты харчавання, цяглавая сіла, сыравіна для промыслаў і рамёств ˘

- Буйная рагатая жывёла
- Коні, валы
- Свінні,  авечкі, козы
- Куры, гусі, качкі

# 2.2. Промыслы і рамёствы

- ***Рамяство*** – выраб ручным спосабам і простымі прыладамі працы розных рэчаў хатняга ўжытку, адзення, абутку, с/г інвентару, транспартных сродкаў.
- ***Промыслы*** – збіральніцтва, паляўніцтва, рыбалоўства, бортніцтва, лясныя промыслы.
- ***Стадыі развіцця рамяства*** – хатняе, на заказ, на рынак (таварнае)
- ***Жаночыя заняткі*** – апрацоўка льна, воўны, прадзенне, ткацтва, вязанне, вышыўка, вытворчаць харчовых тавараў, збіральніцтва.

# Збіральніцтва

- Травы і карняплоды, ягады, грыбы, мёд дзікіх пчол, раслінныя сокі, лекавыя расліны

# Рыбалоўства

- Палессе, Паазер’е – найбольш распаўсюджана
- Карп, стронга, ракі, ўюны, лешч, акунь, шчупак
- Рыбалоўныя арцелі, адсутнасць правіл лоўлі

# Бортніцтва (пчалярства)

- Этапы – бортніцтва, пчалярства калоднае (з XV ст., рамачнае (з 30-х гг. XX ст.)
- Цэхі і брацтвы бортнікаў (XVI-XVIII с.)

Калоды, рамачныя вуллі

# Паляўніцтва

- З XVII ст. знікненне відаў і скарачэнне арэалаў жывёл пад уздзеяннем чалавека.
- Агнястрэльная зброя з XVI ст., пасля 1812 г. шмат у сялян
- Выкарыстанне самаловаў (сеткі, ямы)

ту тарпа высакародны

Нацыянальныя паркі – Белавежская пушча, Нарачанскі, Браслаўскія азёры, Прыпяцкі; Бярэзінскі біясферны і Целяханскі запаведнікі;

# Кавальства

- апрацоўка металу, першае самастойнае рамяство.
- Рамесны і с/г інвентар, аздабленне жылля, культавых пабудоў

# Дрэваапрацоўчыя рамёствы

- У XVII ст. больш за 30 прафесій.
- ***Цяслярства*** – выраб і ўстаноўка драўляных канструкцый вялікіх памераў.

***Сталярства*** – звязана з цяслярствам, завяршальная стадыя будаўніцтва (*аконныя рамы, дзверы, мэбля*)

- ***Бондарства*** – выраб драўлянага посуду з клёпак (планак)

Хатняе начынне,
маслабойка

- ***Стальмашное рамяство*** – выраб транспартных гужавых сродкаў

# Разьба па дрэве

ліштв
а

# Ганчарства

- У X ст. ганчарны круг (ручны, нажны)
- Мужчынскае рамяство, дзеліцца на гарадское (цэхавае) і сельскае.
- Спосабы абпалу - абварванне, задымліванне, глазураванне (паліванне)

# Ткацтва

- X-XIII ст. – гарызантальны ткацкі станок
- Кастрычнік – мялі, трапалі лён
- Лістапад – пачыналі прасці (верацяно, калаўрот)
- Пражу бялілі, фарбавалі, снавалі
- Сакавік – ткалі (кроснь

# 2.3.Беларускае народнае жыллё

- ***Сялянская сядзіба*** – ансамбль жылых і гаспадарчых пабудоў
- ***Тыпы двара***:

- вяночны (паўн.-усх.)

- пагонны (паўд.-зах)

- з нязвязанымі

пабудовамі (цэнтр)

# Інтэр’ер і планіроўка жылля

- Сістэма поглядаў на будову свету вызначала сімволіку пабудовы жылля, яго арыентацыі ў прасторы, унутраннай планіроўкі. Хата- паменшаная мадэль сусвету.
- Будавалі з сасны, алешыны ці асіны зрубным спосабам.
- Вокны на поўдзень ці ўсход
- сцены і страха – засцярога ад знешняга свету
- вокны і дзверы – камунікацыя са светам

курная хата (без дымахода) да 60-х гг. XIX ст.

Двухкамерная
хата

# Страха

стрэхі крылі чаротам,
саломаю
гонтай, дранкай

Страха – рубеж, які аддзяляе сферу неба ад сферы людзей.
Гарышча не абсталёўвалі для жылля, лічылі, што там жылі душы продкаў ці дамавік

Падлога – супрацьлеглае страсе, зближалася з глебай (глінабітная, зямляная ці драўляная)
Узровень ніжэй сядзення – падземны свет, свет нячысцікаў

Унутраная прастора хаты – зямны свет
Асноўная дыяганаль – печ – покуць (чырвоны кут)

***Печ*** - язычніцкі цэнтр хаты, вобраз сусветнага дрэва, “нязгасны агонь”

Бабін
кут

***Покуць*** (чырвоны кут) – хрысціянскі цэнтр хаты
Абавязковыя элементы – абразы, пакрытыя ручніком, стол;
маглі стаяць першы і апошні снапы, хлебная дзяжа

***Стол*** – цэнтр зямнога жыцця, месца сімвалічнага абмену паміж людзьмі і Богам, сімвал урадлівай глебы

***Хлеб*** – сімвал дабрабыту

# ***Парог*** – мяжа «свайго» і «чужога» свету

**Дзверы** – сувязь са знешнім светам і засцярога ад яго

**Акно** – сувязь жылля з сонцам; раслінны арнамент – засцярога ад злых сіл

# 2.4 Беларускае традыцыйнае адзенне

- Асновы беларускага нацыянальнага касцюма склаліся ў XIII ст.
- Адзенне давала інфармацыю аб сацыяльным і сямейным статусе, паказвала з якой мясцовасці чалавек.
- “Строй” - лакальныя асаблівасці традыцыйнага адзення (каля 40).
- Унутры строю адрозніваюць мужчынскі і жаночы касцюмы.

**Нацыянальны фактар касцюму праяўляецца ў:**

- тыпе крою (злучэнне ў адно цэлае канструктыўных дэталей)
- форме галаўных убораў
- характары упрыгожванняў
- ***каларыстыцы тканіны***

# Жаночы касцюм

***сарочка*** (агульнаславянскі тэрмін)
***кашуля*** (сярэдняя паласа)
***рубаха*** (Віцебшчына)

палікавы
крой

крой з
гесткай

***спадніца***
***андарак*** (з шарсцяной тканіны)
***саяны*** (аднатонная спадніца з купленага сукна)
***панёва*** (доўгая да пят спадніца)
***фартух*** (пярэднік)

кабат, гарсэт, шнуроўка, каптан, станік, безрукаўка, кітлік

# Дзявочыя галаўныя ўборы

плётка, утпётка,
вянок

# Жаночыя галаўныя ўборы

складаўся з 3 частак: абруч, чапец, намітка

# Заходняе Палессе

# Усходняе Палессе

# Падняпро
# ўе

# Цэнтральная Беларусь

# Панямонн
# е

**Паазер’е (Падзвінне)**

# Мужчынскі касцюм

***сарочка, кашуля, рубаха***:

-тунікападобныя,

- палікападобныя,

- на гестцы,

-з плечавымі швамі насілася навыпуск, падпаясвалася поясам (пасак, акрайка, кушак)

штаны, порткі, нагавіцы, шаравары

камізэлька, жылетка, чулейка

# Мужчынскія галаўныя ўборы

шытыя, валяныя,
плеценыя

кучма,
аблавуха,
капялюш,
магерка

# Верхняе адзенне (вопратка)

Світа, сярмяга, армяк, бурнос,
жупан
Кажух, шуба

# Мотальскія кажухі

# Абутак

Лапці, лыкі, пасталы, бяспятнікі, шчарбакі
Пахлапні – святочныя лапці касога пляцення

Боты, чобаты, сапагі

Чаравікі, боцікі

Валёнкі,
валенцы

# Дрыбінскія шапавалы

# 2.5 Традыцыйная культура харчавання

# Традыцыйная культура харчавання ўключае:

- Набор прадуктаў і стравы, якія з іх гатуюць
- Спосабы і прыёмы прыгатавання (тэхналогія)
- Трапезы, час і парадак іх выканання
- Правілы паводзін, звязаныя з прыгатаваннем і ўжываннем ежы (застольны этыкет)
- Прадметы хатняга начыння

# Прадукты харчавання

- Зерневыя
- Агароднiна
- Прадукты жывёлагадоўлi
- Садавiна
- Прадукты збiральнiцтва

# Групы страў

***Мучныя і крупяныя***

**Хлеб – сімвал дабрабыта**

Бліны, абаранкі,
аўсяны кісель, зацірка,
кулеш, клёцкі, кулага

***Кашы***: гушча, груца, панцак, куцця

***Суп***: крупнік

# Стравы з агародніны і прадуктаў збіральніцтва

Капуста – першая страва з агародніны
Халаднік

Галушкі, клёцкі, камы, дранікі, бабка, бульбішнікі, салонікі, паронкі

Бульба не знайшла прымянення ў святочна-абрадавай культуры

# Мясныя і малочныя стравы

Сала, здор, лой (авечы)
Вэнджанае мяса,
каўбасы

Малако, кіслае малако, тварог, масла, сыр, смятана

# Рыбныя стравы

# Напоі

- Асаблівасць – залежнасць ад сезонаў і даступнасці сыравіны
- Медавуха, бярозавы сок, кампоты і кісялі, ква

Піва, гарэлка (аквавіта)

# Тэхналогія прыгатавання страў

- ***Варка, пячэнне, тушэнне, парэнне***
- *Прываркі* – аснова стравы (крупы, агародніна)
- *Закалоты* – загушчэнне стравы (мука, бульба)
- *Волагі* – паляпшалі якасць (тлушчы, смятана, алей)
- *Закрасы* – змянялі знешні выгляд стравы і смак (соль, малако)
- *Прысмакі* – паляпшалі смак, прыдавалі асаблівасць страве (мяса, рыба, цыбуля, перац)

- **Спецыфіка беларускай кухні** – з простага прадукта пры складанай і працяглай апрацоўцы атрымліваецца шмат страў (бульба)
- ***Квашанне, саленне, сушэнне, вэнджанне***
- Прыгатаванне ежы – выключна жаночая справа, якая мае невысокую каштоўнасць у грамадстве.

# Трапезы

- Дзеянні з пэўным знакавым зместам, якія ўключаюць спажыванне пэўных страў і правілы паводзін у гэты час.
- ***Штодзенныя трапезы*** – сняданак, абед, падвячорак, вячэра. Мелі сезонныя асаблівасці (палявыя работы)

- Трапеза мела дыдактычную функцыю – перадача вопыту, традыцый, засвойванне нормаў маралі малодшым пакаленнем.

# Святочна-абрадавыя трапезы

- Звязаныя са святамі ***каляндарнага цыклу***

Перад святам 3 абрадавыя трапезы (***куцці***):

- *Посная* (вялікая) – перад першым днём свята
- *Багатая* (тоўстая, шчодрая) – перад Новым годам
- *Посная* (галодная, вадзяная) – перад Вадохрышчам

- Звязаныя з абрадамі ***сямейнага цыкла***
- ***Вясельная трапеза***: каравай

- ***Радзінная трапеза***: бабіна каша
- ***Пахавальная трапеза*** (у дзень пахавання і праз 3, 9, 40 дзён): куцця
- ***Памінальная трапеза - Дзяды***: канун з абаранкамі (пачатак) – яечня і каша (канец)